# НА КРЫЛАХ МАРЫ

*Нарадзіўся ў 1921 годзе ў горадзе Магілёве ў сям'і рабочага. Член КПСС. Закончыўшы сярэднюю школу, паступіў у авіяцыйнае вучылішча. У час Вялікай Айчыннай вайны ваяваў на многіх франтах у якасці лётчыка-знішчальніка, камандзіра звяна і эскадрыллі.*

*Званне Героя Савецкага Саюза старшаму лейтэнанту Міхаілу Васільевічу Лусто прысвоена Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 27 чэрвеня 1945 года.*

Чкалаў, Громаў, Асіпенка, Вадап'янаў... Хто з хлапчукоў 30-х гадоў не хацеў быць падобным на іх, браць прыклад з іх! Не выключэннем быў і Міша Лусто. Ён чытаў і многа раз перачытваў паведамленні аб пералётах "АНТ-25": Масква – о. Уд, Масква – Паўночны полюс – ЗША. Разам з Асіпенка, Расковай і Грызадубавай з вышыні палёту "Радзімы" аглядаў неабсяжныя прасторы сваёй краіны. На крылах фантазіі лятаў скрозь пургу і мяцеліцу да чалюскінцаў. Марыў ажыццявіць тое, што не паспеў зрабіць Чкалаў: "абляцець вакол шарыка...".

Крылы мары прывялі Міхаіла ў Магілёўскі аэраклуб. "ПО-2" і "Р-5" – не дасканаласць авіяцыйнай тэхнікі. На іх не паляціш далёка і не ўзнімешся высока. Аднак без іх... Міхаіл з захапленнем прамываў, чысціў дэталі матораў, браўся за ўсялякую "брудную работу". І чытаў. Чытаў падручнікі, інструкцыі. Разбіраўся ў схемах, чарцяжах. Не даваў спакою інструктарам, старым аэраклубаўцам. І неяк само сабой атрымалася – ён першым з таварышаў быў дапушчан да самастойных палётаў.

– Ура! Слухаецца. слухаецца... – ускрыкнуў Міхаіл, калі "ПО-2" набраў вышыню, выраўняўся і паляцеў над Магілёвам. З захапленнем агледзеў ён бяскрайнюю сінь неба, кінуў погляд уніз. Там – па дахах дамоў, па знаёмых плошчах і вуліцах – імгненна нёсся цень самалёта. Хваля радасці захліснула ўсю яго істоту.

1940 год. Сярод курсантаў ваенна-авіяцыйнага вучылішча Міхаіл Лусто нічым не вылучаўся. Ды і цяжка было чым-небудзь вылучыцца – у вучылішча прыйшлі хлопцы, для якіх авіяцыя была сэнсам усяго жыцця. Праўда, ён можа больш чым іншыя, займаўся вывучэннем гісторыі развіцця авіяцыі і яе ўдзелу ў баявых дзеяннях. Некалькі адрознівала яго ад таварышаў здзіўляючая настойлівасць дакапацца да прычын той або іншай непаладкі, выяўленай у машыне ў час палётаў, і нястрымная цяга да распытванняў лётчыкаў, якія ўжо ўдзельнічалі ў паветраных баях у небе Іспаніі і над сопкай Заазёрнай, у небе Манголіі і пад лініяй Манергейма.

Лусто быў перакананы, што ўсе гэтыя веды, атрыманыя звыш праграмы, усе гэтыя звесткі, пачэрпнутыя з вопыту бывалых знішчальнікаў спатрэбяцца яму і дапамогуць хутчэй стаць у строй адважных сокалаў сацыялістычнай Радзімы. Полымя ж другой

сусветнай вайны перакінулася ўжо на родныя сёлы і гарады. Ён імкнуўся хутчэй трапіць на фронт. Пісаў рапарты. Аднак прыбыў у дзеючае авіяцыйнае злучэнне толькі ў пачатку 1943 года.

– Таварыш гвардыі падпалкоўнік! Лётчык-знішчальнік лейтэнант Лусто прыбыў у ваша распараджэнне для праходжання далейшай службы, – звонка дакладваў Міхаіл камандзіру 129-га гвардзейскага знішчальна-авіяцыйнага палка.

– Адкуль родам. лейтэнант? – запытаў падпалкоўнік і, не чакаючы адказу, пачаў чытаць прадпісанне маладога лётчыка. Узняў галаву і ўважліва паглядзеў у вочы Міхаіла. – З Магілёва, кажаш? Так... Ну, што ж, будзеш лепш біцца, як і трэба біцпа гвардзейцам...

Лётчыкі-гвардзейцы! Ганаровае званне. Мужнасцю, беззапаветнай храбрасцю заваявана яно А ты, Міхаіл Лусто, прыйшоў, як гаворыцца, на ўсё гатовенькае. Пачапіў гвардзейскі значок. Пачаў звацца гвардыі лейтэнантам.

Гэтыя думкі не пакідалі Міхаіла ні на мінуту і на зямлі, і ў паветры.

Наступіла вясна. Усё часцей і часцей "Які" гвардзейскага палка сталі вылятаць на баявыя заданні: суправаджаць бамбардзіроўшчыкі, штурмаваць калоны варожых войск, перахопліваць армады "юнкерсаў", "хейнкеляў", "месершмітаў".

Толькі ў маі – ліпені Міхаіл Лусто зрабіў 39 баявых вылетаў і правёў сем паветраных баёў. Асабіста збіў два фашысцкія самалёты. На грудзях зазззяў першы ордэн. Быў зроблен першы крок па службовай лесвіцы: з вядомага ператварыўся ў вядучага звяна...

...14 студзеня 1944 года чацвёрка "Якаў" вярталася на аэрадром. Ззаду цяжкі бой з дзесяткам "фоке-вульфаў". Баязлівымі сталі гітлераўскія асы! Даводзіцца ганяцца, як за зайцамі. Але нічога, трох усё-такі "прызямлілі".

Старшы лейтэнант прывычным поглядам акінуў зацягнутае цёмнымі воблакамі неба. Тры вядомыя знішчальнікі ішлі побач. Уперадзе дымілі пажарышчы вызваленага Кіравагграда.

– Сокал, паглядзіце ўправа, – раздаўся ў шлемафоне знаёмы голас аднаго з вядомых.

Лусто павярнуў галаву. З вялікага малочна-белага воблака адзін за адным выныралі "юнкерсы". Адзін, два, дзесяць, дваццаць... Над "юнкерсамі" ішло звяно "месершмітаў". Мільгануўшая. як маланка, думка, што на зыходзе гаручае і боепрыпасы, не спыніла камандзіра.

Рабі, як я, – перадаў ён па радыё загад і развярнуў свайго "Яка" ўправа і ўніз.

Нападзенне было настолькі нечаканым і смелым, што фашысцкія бамбардзіроўшчыкі адразу страцілі строй і змяшаліся, падстаўляючы пад агонь гармат і кулямётаў чырваназоркавых знішчальнікаў самыя слабыя месцы. Задыміў і паляцеў уніз адзін, у паветры ўзарваўся другі... Скінуўшы бомбы на галовы сваіх войск, "юнкерсы", як варанне, разляталіся ў розныя бакі.

Смеласць і рашучасць, уменне навязаць ворагу сваю волю і выкарыстаць фактар нечаканасці – гэтыя якасці спадарожнічалі Лусто ў небе Румыніі. Чэхаславакіі, Венгрыі. Германіі.

320 баявых вылетаў за два гады вайны, 100 паветраных баёў, 18 асабіста збітых фашысцкіх бамбардзіроўшчыкаў і знішчальнікаў. Дзевяць – у групавых баях. Такі ўклад Міхаіла Васільевіча Лусто ў перамогу савецкага народа над фашысцкай Германіяй.

Даўно адгрымела вайна. У мірным савецкім небе да гэтага часу чуваць гул рэактыўных рухавікоў самалётаў, штурвал якіх знаходзіцца ў цвёрдых руках героя Вялікай Айчыннай вайны і яго вучняў – новага пакалення савецкіх сокалаў.

**На крылах мары // Магілёўская праўда. — 1970. — 13 лістапада. — С. 4.**